ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 117 (1386) | НЯДЗЕЛЯ, 24 мая 1931 г.



Рабочыя Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату зьвярнуліся да рабочых лесасплаву з заклікам організаваць лепш сваю працу, змагацца і дамагацца поўнага выкананьня кантрольных лічбаў на прынцыпах шырока-разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, барацьбой за тое, каб плыты гналі ўдарныя брыгады плытагонаў.

Мінула некалькі дзён. Ня гледзячы на гэта, да сёнешняга дню організаванага адказу плытагонаў ня было.

Гэта ў той час, калі рад леспрамгасаў ня выканаў кантрольныя лічбы, не забясьпечыў патрэбных тэмпаў сплаву. Прыкладам гэта можа зьявіцца Петрыкаўскі і Чэрвеньскі леспрамгасы, якія, на жаль, не зьяўляюцца адзінкамі.

Кантрольныя лічбы лесасплаву павінны быць даведзены да кожнага плытагона. Аддзел сплаву Лесбелу павінен на падставе агульнага пляну вызначыць кантрольнае заданьне на кожную дэкаду. Неабходна змагацца за кожную хвіліну сёнешняга дню, бо заўтра будзе позна.

Неабходна палепшыць культурнае абслугоўваньне плытагонаў. Пытаньнем організацыі грамадзкага харчаваньня на сплаве павінна заняцца кожная комсамольская ячэйка. „Чырвоная Зьмена" ўключылася ў дэкаду праверкі. Слова за раённымі організацыямі і ячэйкамі.

Адказвайце, мы чакаем!

Ня турбуюцца

Чэрвень. (Ад нашага юнкора). Сплаў лесу—пад пагрозай. Ня гледзячы на шматлікія дырэктывы аб правядзеньні лесаплаву ва-ўдарным парадку, Чэрвеньскія колгасы ў гэтай галіне бязьдзейнічаюць.

Арцелі па сплаву не створаны.

Культурна-выхаваўчая работа сярод рабочых ня вядзецца. Па шэрагу прыстаняй (Дарыпрут Нованіва) па рацэ Вусе, якая ўпадае ў р. Бярэзіну лес ня вяжацца. Мост, зьнесены паводкай на прыстані Нованіва, ня будуецца. Леспрамгас і Чэрвеньскі комбінат ніяк не дагаворацца хто павінен будаваць мост. Чэрвеньскі РВК ня прымае ніякіх мер.

Міхась Ракіта

Ня брадь стаўку на мінімум

Кіраўніцтва сплаўнага сэктару Лесбелу не забясьпечвае опэрацыйнага кіраўніцтва сплавам

Яшчэ ў сакавіку-красавіку месяцы, калі рака яшчэ ня ўскрылася і асноўным рашаючым момантам выкананьня пляну сплаву была своечасовая падрыхтоўка да сплаву: нарыхтоўка гужбы і інш., „Чырвоная Зьмена" сыгналізавала аб дрэнным ходзе падрыхтоўкі.

Адзначаючы месца сплаўнога сэктару Лесбелу як кіраўніка сплаву па БССР, „Чырвоная Зьмена" досыць яскрава сказала аб недастатковым кіраўніцтве справай падрыхтоўкі да сплаву з боку сэктару.

Зараз сплаў разгарнуўся. Зараз кожны дзень вырашае посьпех сплаву. Мы ўжо можам падвесьці некаторыя вынікі папярэдняй працы.

Плян падвозкі драўніны да сплаўных пунктаў у рашаючыя месяцы быў сарваны. Сплаў драўніны па шматлікіх сплаўных пунктах ідзе нездавальняюча. Асобныя леспрамгасы яшчэ не распачалі сплаў.

Кіраўнікі сплаўнага сэктару Лесбелу, апынуўшыся перад фактам невыкананьня плянаў падвозкі дрэва і дрэннай опортуністычнай працы асобных леспрамгасаў, ставіць пытаньне аб зьніжэньні пляну сплаву.

Зацьверджанае вышэйшымі гаспадарчымі органамі заданьне сплаву па БССР, па іх думцы, ня можа быць выканана, яно нерэальна. Гэткая ўстаноўка ў загадчыка сплаўнога сэктару спэцыялістага.

Опортуністыя з кіраўніцтва замест таго, каб пайсьці па лініі максымальнага скар' с ... вя магчымасьцяй для поўнага выкананьня пляну, шукаюць выйсьця ў скарачэньні заданьня.

Вызначаны спачатку плян сплаву па БССР зусім рэальны.

Леспрамгасы Беларусі досыць перакананаўча давялі сваю працаздольнасьць у час паводкі.

Пры бальшавіцкім кіраўніцтве і максімальным разгортваньні соцспаборніцтва і ўдарніцтва на сплаве плян павінен быць і будзе выкананы

А.

Будзе 1.282.727 кубамэтраў.

10-га мая 516.410 кубамэтраў.

20-га мая 825.725 кубамэтраў.

Тэлеграма-маланка з Масквы

Менск. ЦК ЛКСМБ

Штаб садзейнічаньня лесасплаву пры „Комсомольской Правде" з 20 мая па 10 чэрвеня абвясьціў усесаюзную комсамольскую дэкаду праверкі організацыі грамадзкага харчаваньня на сплаве.

Штаб зварочваецца да краявых, абласных і раённых організацый УсеЛКСМ з просьбай уключыцца ў дэкаду. Праз друк мобілізаваць увагу комсамолу на гэтым важнейшым мерапрыемстве.

Аб ходзе дэкады штодзённа паведамляць „Комсомольскую Правду".

„Комсомольская Правда"—Бабушкін.

„Чырвоная Зьмена" ўключаецца

„Чырвоная Зьмена" ўключаецца ва ўсесаюзную комсамольскую дэкаду праверкі організацыі грамадзкага харчаваньня на сплаве.

Выклікаем райорганізацыі комсамолу, комсамольскія ячэйкі, юнкорыю і рабочых сплаву ўключыцца ў дэкаду. У час дэкады выкрыем і зьнішчым недахопы грамадзкага харчаваньня на сплаве.

Організоўвайце юнкораўскія брыгады - праверкі. Чакаем тэрміновага матар'ялу.

„Чырвоная Зьмена".

15000 кубмэтраў драўніны ня спушчаны ў раку

Яшчэ ў красавіку месяцы павінны былі пайсьці плыты, але Пятрыкоўскі леспрамгас яшчэ да гэтага часу не распачаў сплаў. За красавік месяц павінна было быць сплаўлена 15 тысяч кубамэтраў дрэва. Аднак заданьне ня выканана.

На сплаве адчуваецца значны недахоп рабочай сілы. У гэты-ж час вельмі нерацыянальна скарыстоўваецца тая рабочая сіла, якая ёсьць.

Зусім слаба разгорнута грамадзка-палітычная, выхаваўчая праца сярод ласарубаў і плытагонаў. На вучастку не організавана ніводнай ударнай брыгады.

Усё гэта ставіць пляны лесасплаву пад пагрозу зрыву. Петрыкаўскі леспрамгас павінен забясьпечыць выкананьне вызначаных лічбаў.

Пост „Ч. З." Пінчук

Кальцо паўстаньняў і забастовак сьціскае імпэрыялістычны сьвет

„Далоў дыктатуру фашызму"

ВАРШАВА. У цэнтры Варшавы адбыліся дэмонстрацыі рабочых пад комуністычнымі лёзунгамі: „патрабуем аслабаненьня політычных зьняволеных" „далоў дыктатуру фашызму" „Няхай жыве савецкая Польшча" і г. д.

Конная поліцыя з агаленымі шашкамі атакавала дэмонстрантаў, зьбіваючы рабочых. Рабочыя некалькі разоў рабілі спробу працягнуць дэмонстрацыю, кожны раз разганяемую ўзброеннымі поліцэйскімі.

Хваля забастовак у фашысцкай Польшчы павялічваецца

ВАРШАВА. Сёньнешнія газэты перапоўнены паведамленьнямі аб працягваючайся хвалі забастовак, дэмонстрацый рабочых і беспрацоўных. Адбываюцца новыя масавыя скарачэньні зарплаты і звальненьні рабочых з прадпрыемстваў.

Буйнейшы мэталюргічны завод „Лаўра" на якім працуе 1200 рабочых зачыняецца. У копях Дамброўскага басэйну масавыя сходы рабочых прымаюць патрабаваньні ўсеагульнай забастоўкі. У Яворне на 3-х тысячным мітынгу рабочых і іх сем'яў прадстаўнік ўраду заявіў, што ўмовы працы і аплаты зьменены ня будуць.

50 ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ НА ПАХАВАНЬНІ ЗАБІТЫХ ПОЛІЦЫЯЙ ГАРНЯКОЎ

ВАРШАВА. На вугольных шахтах у Яворне (Дамброўскі басэйн) адбыліся пахаваньні забітых 19-га мая, у час растрэлу поліцыяй рабочай дэмонстрацыі гарнякоў. У пахавальнай дэмонстрацыі, праходзіўшай пад аховай поліцэйскіх атрадаў, удзельнічала звыш 5 тысяц рабочых—сярод іх делегацыі гарнякоў ад усіх шахт Дамброўскага басэйну.

Польскі друк працягвае паклёпніцкую кампанію

ВАРШАВА. Міралюбівая заява міністра Польшчы Залескага у сувязі з выступленьнем тав. Літвінава не знаходзіць ніякага водгуку у польскім друку.

Толькі адна „Газета Варшаўска" піша, што польскі ўрад, відавочна перапалохаўся ў неабходнасьці адмежаваньня ад цёмных змоўшчыцкіх колаў, якія падрыхтоўваюць інтэрвенцыяністычныя антысавецкія пляны. Але нават і гэта газэта выказвае коснавае ўласнае сумненьне, ці будзе польская замежная палітыка на справе адпавядаць зьместу жэнеўскіх прамоў Залескага. Астатнія газэты працягваюць паклёпніцкую кампанію звычайных выпадаў супроць Комінтэрну.

Забастоўкі ахапляюць гарады Швэцыі

СТОКГОЛЬМ. Забастовачныя камітэты у Одалене, Сундсвальле, Гудыкавальле, у Ігасундэ і Седэргамэ зьвярнуліся да ўсіх рабочых з заклікам пасьледаваць прыкладу рабочых гэтых раёнаў і абвясьціць забастоўку ў мэтах падтрымкі рабочых у Марме.

У Стокгольме бастуюць рабочыя будаўніцтва, слесары рабочыя „Дженэраль мотарс кампані" і іншых прадпрыемстваў, у астатніх будзе праведзена пяцьхвілінная забастоўка. Дэмонстрацыі компартыі забаронены. У сувязі з чаканымі хваляваньнямі ў Стокгольме мобілізаваны буйныя сілы поліцыі.

***

СТОКГОЛЬМ. Організаваныя МОПР'ам пахаваньні забітых рабочых у Крамфурсе выліліся ў вялікую пролетарскую дэмонстрацыю. На пахаваньнях прысутнічала 30 тысяч чалавек, у тым ліку дэлегаты рабочых організацый усёй Швэцыі. Пахаваньнямі кіраваў член стачачнага камітэту, комуніст Нордстром. На пахаваньнях выступіў з прамовай член ЦК компартыі тав. Сілен. У Гётборге соцдэмократычныя рабочыя замест рэформісцкай пяцьхвіліннай паўзы організавалі гадзінную забастоўку.

Рэнегаты папярэджваюць супроць „комуністычных провакацый"

СТОКГОЛЬМ. У адбыўшайся з дазволу поліцыі дэмонстрацыі рэнегатаў прыняло ўдзел толькі 1500 чалавек. Прамоўцы, паўтараючы буржуазную прэсу, папярэджвалі супроць „комуністычных провакацый" і заявілі, што „комуністыя часткова віноўны ў дзеньнях".

Новае выступленьне тав. Літвінава

ЖЭНЕВА.—Выступаючы ў спрэчках на пленарным пасяджэньні эўропейскай камісіі па абгаварэньню праэкта аб аграрных крэдытах, тав. Літвінаў заявіў:

— „Умовы крэдытаваньня такія, што крэдытамі змогуць карыстацца толькі абшарнікі і кулацкія гаспадаркі, шматлікае дробнае сялянства і фэрмэры, ня ўладаючыя каштоўнай маемасьцю, ці даўно яго залажыўшыя, ніякай карысьці з банку не атрымаюць".

Тав. Літвінаў заявіў, што ён лічыць лішнім супярэчыць супроць організацыйнай формы банку, пакуль ня будуць зьменены асноўныя ўмовы яго дзейнасьці, „бо організацыя банку Лігай, у працягнутым выглядзе ня можа мець значэньня з пункту погляду зьмягчэньня крызісу.

25-га мая, а 7-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" адбудзецца пашыраная нарада па пытаньню **развіцьця энэргетыкі БССР і задачы рабселькораўскага руху**

На нараду запрашаюцца спэцыялістыя, прадстаўнікі комсамольскіх і партыйных ячэек, рэдактары шматтыражак і насьценгазэт, ударнікі, рабкоры і юнкоры наступных установ і прадпрыемстваў: ВЭО, СЭО, Энэргааддзел ВСНГБ, Белторпу, Эльводу, Дзяржпляну, Гаркому ЛКСМБ, заводу Варашылава, „Комунар", „Бальшавік" і „Дрэваапрацоўшчык".

Просьба прыйсьці без спазьненьня.

РЭДАКЦЫЯ

На рашаючы вучастак мяснОй проблемы

23 мая пачаўся дэкаднік сьвінагадоўлі

„Сьвінавод" павінен выканаць сваю вытворчую програму, усю працу савгасаў—на гаспадарчы разрахунак

У максымальна кароткі тэрмін скончыць мобілізацыю 2000 комсамольцаў для „Сьвінавода"

Зламаць супраціўленьне творчай ініцыятывы мас

Ударныя брыгады саўгасу „Івань" павінны перайсьці на гаспадарчы разрахунак

Слуцкі РК ЛКСМБ, абгаварыўшы на бюро і райактыве пытаньне аб пераводзе ўдарных брыгад на вышэйшую супень соцспаборніцтва і ўдарніцва—гаспадарчы разрахунак, мобілізаваў 10 комсамольцаў для правядзеньня гэтай работы у саўгасах „Сьвінаводу".

Выехаўшыя брыгады распрацавалі з моладзьдзю сьвінаводчых саўгасаў „Івань" і „Некрашы" адозву Ленінградзкіх ударных брыгад і актыву комсамолу аб пераводзе ўдарных брыгад на гасразрахунак.

У сьвінаводчым саўгасе „Івань" організаваны брыгады, абгавораны соцдагавор брыгад.

Комсамол шырока разгарнуў па раёну работу для ўзьняцьця якасьці працы, соцспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень, пераводу ўсіх брыгад саўгасаў на гаспадарчы разрахунак.

Аднак, комсамольская організацыя ў сваёй рабоце не сустракае дапамогі з боку гаспадарнікаў і спэцыялістых саўгасаў. Наадварот, наглядаюцца перашкоды.

Ня гледзячы на тое, што проэкт дагавору аб гаспадарчым разрахунку, работніцамі саўгасу „Некрашы" быў шырока абгавораны і прыняты, кіраўнік гэтага саўгасу Філіпчык зрывае перавод брыгад на гаспразрахунак. Ён на сходзе выступіў з такой прамовай „Гэта добрая штука, але-ж гэта магчыма ўвесьці толькі пры машыне, на фабрыцы, на заводзе, а не ў сельскай-гаспадарцы. Я асабова, быўшы на працы сьвінаводаў не закабаліў-бы сябе гэтым дагаворам. Мала-што можа адарыцца: сьвінагадоўля можа быць убытачнай, альбо чума ўдарыць—зваліць 100 штук, тады, што рабіць? Ударнікам адказваць! Гэта-ж жывы матар'ял—у пастку лезьці боязна". Так „агітаваў" за гаспадарчы разрахунак кіраўнік саўгасу „Некрашы" Філіпчык.

Сьледам за Філіпчыкам і спэцыялісты моўчкі абыходзяць ажыцьцяўленьне ініцыятывы рабочых па пераходзе ўдарных брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Кіраўніцтва сьвінагадоўчага саўгасу „Івань" баючыся „як-бы чаго ня выйшла", ігнаруе ажыцьцяўленьне дырэктывы партыі аб пераходзе саўгасаў на гаспадарчы разрахунак і душаць ініцыятыву рабочых мас аб пераводзе працы брыгад на вышэйшую форму соцспаборніцтва і ўдарніцтва-гаспадарчы разрахунак.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі павінны з усёй бальшавіцкай рашучасьцю ўдарыць па права-опортуністычнай практыцы кіраўніка саўгасу „Івань" Філіпчыка.

Саўгас павінен быць поўнасьцю пераведзены на гаспадарчы разрахунак і ініцыятыва рабочых саўгасу аб пераводзе ўдарных брыгад на гаспадарчы разрахунак павінна быць зьдзейсьнена.

Брыгадзір „Ч. З." „Янка"

Пастановай Савету Народных Камісараў БССР з 23-га мая па 23-е чэрвеня абвешчана дэкада сьвінагадоўлі.

Комсамольскія організацыі павінны па-баявому ўключыцца ў правядзеньне гэтай дэкады.

Асноўныя задачы, што стаяць перад комсамолам у праводзімай дэкадзе—мобілізаваць увагу пролетарскай грамадзкасьці дзеля актыўнага ўдзелу сьвінагадоўлі, поўнае выкананьне вытворчых мерапрыемстваў у саўгасе сьвінатрэсту: выкананьне пляну і комплектаваньне гурту, падвядзеньне кармовай базы, выкананьне пляну будаўніцтва сьвінарнікаў і перавод на гаспадарчы разрахунак усіх саўгасаў.

Комсамольскія організацыі павінны забясьпечыць у максымальна кароткі тэрмін сканчэньне мобілізацыі 2-х тысяч комсамольцаў на працу ў колгасы сьвінаводу.

З комсамольскім запалам, у бой на рашаючым вучастку ў вырашэньні мясной праблемы.

Задачы комсамольскіх ячэек жывёлагадоўчых саўгасаў і колгасаў

Вырашыўшы ў асноўным, зернавую проблему, наша партыя на парадак дня паставіла проблему стварэньня соцыялістычнага жывёлаводзтва шляхам форсаванага будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў і колгасаў. Выкананьне гэтай проблемы ускладае вялізарнейшыя задачы на ўвесь комсамол і, у асаблівасьці, на ячэйкі жывёлаводчых саўгасаў і колгасаў. Кожная ячэйка павінна практычна выконваць проблему жывёлаводзтва на конкрэтных вучастках. Сваю работу ячэйкі павінны пабудаваць так, каб гаспадарчыя пытаньні,—пытаньні разьвіцьця колектыўнага умацаваньня жывёлаводчай гаспадаркі—стаялі ў цэнтры іх увагі.

Аднэй з галоўных умоў выкананьня жывёлаводчай проблемы зьяўляецца стварэньне моцнай кармовай базы. Гэта ўмова з усёй катэгорычнасьцю падкрэсьлена XVI Зьездам партыі і зьездам Саветаў.

За час сяўбы комсамольскія ячэйкі павінны дабіцца поўнага выкананьня пасеўнага пляну ў 500 тысяч га кармовых культур і ўвесь час наглядаць за іх доглядам і ўборкай.

У гэтым годзе мы павінны закласьці і высеяць неабходныя плошчы семянковых траў з тым, каб на будучы год мы не адчувалі больш такога востраго недахвату ў насеньні кармовых культур, як гэта было ў бягучым годзе.

Ад комсамольцаў у вялікай меры залежыць выкананьне пляну, якім прадугледжваецца даць для жывёлаводзтва 1 мільён тон сілоснай масы. Змагацца за кожную бакшту, траншэю і яму, за кожную тону сілоснай масы—конкрэтная задача дня. Трэба прывесьці ў спраўны выгляд мінулагоднія будаваньні, організаваць будаўніцтва новых бакштаў і траншэй.

Ячэйкам трэба зараз-жа прыступіць да правядзеньня прасьцейшых мерапрыемстваў па паляпшэньню сенажацяй і пашы, па падвышэньню іх ураджайнасьці, сортазьменнасьці траў.

Аднак, задачы ячэек жывёлаводчых колгасаў і саўгасаў далёка ня вычэрпваюцца толькі пытаньнямі стваварэньня кармовай базы. Комсамол павінен перабудавацца тварам да жывёлагадоўчай вытворчасьці. Гэта абавязвае ячэйкі заняцца організацыяй працы, ўвядзеньнем зьдзельшчыны, разгортваньнем соцспаборніцтва.

Да гэтага часу не ва ўсіх колгасах праводзіцца спэцыялізацыя колгасьнікаў па асобных галінах гаспадаркі: (канюхі, скотнікі, дальшчыкі, сьвінары і г. д.) Часта гэтыя абавязкі выконваюцца колгасьнікамі паперамена. Гэта прыводзіць к пагоршанаму становішчу жывёлы, да памяншэньня яго продукцыйнасьці.

У буйных колгасах пры наліччы спэцыяльных скотных двароў брыгады павінны спэцыялізавацца асобна для кожнага віду жывёлы. Для найвялікшай вытворчасьці працы, каб было залішнія мітусяніны і і затрымак, брыгады трэба разьбіваць унутры на звеньні (дальшчыкі, кармоўнікі, цялятнікі, убіральшчыкі і г. д.)

Комсамольцы павінны быць актывістамі за зьдзельшчыну працы.

Трэба дабіцца найхутчэйшага ўвядзеньня зьдзельшчыны ва ўсіх колгасах і саўгасах. Пры гэтым трэба абавязкова дабіцца таго, каб у выніку зьдзельшчыны ня зьнізілася якасьць работы, каб не пагоршалася, а палепшылася становішча стада.

Ліквідацыя абязьлічкі набывае у жывёлагадоўчых саўгасах і колгасах першаступенную ролю. Кожны конюх скотнік, цялятнік кармавік павінен быць прымацованы да пэўнай групы скота, за якую нясе адказнасьць. Комсамольцы павінны першыя паказаць прыклад ліквідацыі абязьлічкі ў жывёлагадоўлі і даць ўзоры нагляду і кармленьня жывёлы.

Ячэйкі павінны ўзяць шэфства над племянным скатом і маладняком. Каштоўны вопыт асобных ячэек да гэтага часу яшчэ ня стаў набыткам усіх ячэек. Напрыклад, Іванскія комсамольцы Слуцкага раёну ўзялі шэфства над маладняком і будаўніцтвам сілосных ям, дабіліся ў мінулым годзе 100 проц. выкананьня пляну сілосаваньня і палепшылі догляд за маладняком і сьвіньнямі.



Аграном-комсамолец агледае парасят

Аўладаньне зоотэхнікай, ліквідацыя тэхнічнай няпісьменнасьці—абавязак кожнага комсамольца. Трэба ведаць сваю справу ня толькі для таго, каб лепш організаваць працу, павысіць удоі і выхад мяса, воўны, палепшыць племянную справу, зьнізіць ялавасьць, але і змагацца з хваробамі жывёлы, з-за якіх краіна штогодна траціць 1 мільярд рублёў. Організацыі зоовэтгурткоў і пагалоўнаму ахопу імі комсамольцаў і колгаснай моладзі павінна быць аддадзена вялікая ўвага.

Адно з самых вузкіх месц у жывёлагадоўлі—кадры. Востры недахоп кадраў зьяўляецца адным з галоўнейшых тармазоў, затрымліваючых хуткае выкананьне пастаўленай задачы. Трэба дабіцца поўнага выкананьня програмы падрыхтоўкі кадраў для жывёлагадоўчых колгасаў і саўгасаў на ўсіх спэцыяльнасьцях. Лепшых ударнікаў-комсамольцаў і колгасьнікаў ячэйкі павінны вылучыць для навучаньня; па-ўдарнаму скончыць мобілізацыю 2-х тысяч комсамольцаў у жывёлагадоўчыя і сьвінагадоўчыя саўгасы.

У шмат якіх колгасах яўна нездавальняюча абстаіць справа з забесьпячэньнем пагалоўя памяшканьнем. Будаўніцтву скотных двароў, цялятнікаў, сьвінарнікаў, аўчарняў у гэтым сэзоне павінна быць аддадзена сур'ёзная ўвага. Перш за ўсё, неабходна выкарыстаць мясцовы будаўнічы матар'ял. Організаваць брыгады па будаўніцтву скотных двароў, кармушак і г. д.

Мобілізуючы шырокія колгасныя, бядняцка-серадняцкія масы вакол жывёлагадоўчай проблемы, комсамол павінен быць перадавым барацьбітом за соцыялістычную рэконструкцыю жывёлагадоўлі.

Я. Ц.

Саўгас „Некрашы" і ячэйка „Прамень Комуны" зрываюць мобілізацыю ... лік „2000"

Слуцкі райком комсамолу ... апошні час правёў значную работу на мобілізацыі комсамольцаў ... лік „2000" на працу ў сьвінавод... чыя саўгасы. На 1 мая ў саўгас... сьвінаводу „Івань" працавала 1... комсамольцаў.

З вызначаных мобілізаваць 6... чалавек, ужо мобілізавана 25.

Разьвёрстка ЦК ЛКСМБ аб моб... лізацыі 60 чалавек ня выканан... поўнасьцю выключна таму, шт... некаторыя саўгасы „Некрашы" ка... тагорычна адмаўляюцца прыняць ... на працу мобілізаваных комсамол... цаў, тлумачачы гэта тым, што і... рабочыя непатрэбны

Комсамольская ячэйка „Прамен... Комуны" недаацэньвае палітычна... значэньня мобілізацыі комсамольца... для працы ў сьвінаводчых саўгаса... Яна наадрэз адмовілася ад моб... лізацыі.

РК ЛКСМБ павінен ударыць ... усёй рашучасьцю па кіраўніцтв... комсамольскіх ячэек, якія недаацэнь... ваюць політычнага значэньня моб... лізацыі комсамольцаў на працу ... сьвінаводчыя саўгасы і дабіцца ... найкарацейшы тэрмін поўнага вы... кананьня разьвёрсткі ЦК.

Разам з гэтым, ЦК ЛКСМБ тр... ба высьвятліць, чаму сьвінагадо... чыя саўгасы ня прымаюць мобіл... заваных комсамольцаў на работу ... праз адпаведныя органы ўжыць р... шучыя захады да зрыўшчыкаў м... білізацыі „2000".

Брыгадзір „ЧЗ" Прыютам.

Заданьне сустрэлі сустрэчным

Старыя Дарогі. Кантрольнае заданьне па рэалізацыі пазыкі ў 3445 руб. перавыканаў Пасецкі сельсавет Стара-Дароскага раёну.

Бедпякі-серадпякі вёсак гэтага сельсавету энэргічна ўзяліся за выкананьне кантрольных лічбаў рэалізацыі пазыкі, вызначаных сельсаветам для кожнае вёскі. У большасьці вёсак лічбы былі выканаты на 10 красавіка г. г.

Некаторыя вёскі высунулі сустрэчныя пляны рэалізацыі пазыкі. Рэалізацыя пазыкі працягваецца і пасьля 100 проц. выкананьня кантрольнага заданьня. **Сіротка.**

Рабочы дзень трактара— 23 гадзіны

Спыніць прастоі і недагрузку трактароў, зьвесьці да нуля паломку

Трактар павінен працаваць не 18, а 23 гадзіны

ГРЭСК (Па тэлефону ад нашага юнкора). Накіраваныя Слуцкай МТС тры трактары для вясеньняй сяўбы ў колгасе „Чырвоны маяк" Грэскага раёну, больш стаяць, чым, працуюць. Два трактары зусім няспраўны, часта псуюцца і працуюць толькі па 2-3 гадзіны у суткі. Трэці трактар усяго толькі 18-19 гадзін, замест патрэбных 23.

Сярод трактарыстых не разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Трактарыстыя безгаспадарча выкарыстоўваюць гаручае. Для ворыва 12 га затрачана 52 пуды гаручага, тады як на 1 га патрэбна толькі 1 пуд.

Кіраўніцтва Слуцкай МТС павінна ўжыць самыя энэргічныя захады палепшыць работу трактароў. Дабіцца 23-гадзіннай работы іх у суткі. Прыцягнуць да адказнасьці трактарыстых, якія безгаспадарча выкарыстоўваюць гаручае.

Вытворчы плян павінен быць выканан.

Брыгадзір „Ч. З." Макарэнка.

Засеялі 323 га


У Старадароскім р-не за 10 дз... масавай сяўбы колгасы і саўгас... засеялі 323 га яравога кліну.

Дрэнна падрыхтавалася да сяўб... раённая МТС. Трактары рассылалі... па такіх колгасах, дзе ня мож... араць. У выніку 3 трактары зр... білі 7-дзённы прастой.

Трактары дрэнна забясьпечав... гаручым, ад чаго таксама бываю... прастоі.

Ня выконваюцца нормы выпр... цоўкі. Замест 23-гадзін, тракт... у колгасе „Комунар" працуе тол... кі 6-8 гадзін. Трэба зараз-жа нал... дзіць работу ў МТС так, каб ува... трактарны парк быў поўнасьц... скарыставы для ўдарных тэмп... у выкананьні плянаў вясеньн... сяўбы.

Брыгадзір „Ч. З." М. Шэшк...



Трактар павінен быць поўнасьцю нагружан работай

Масавая сяўба па Стара-Дароскаму раёну пачалася. Выяўляецца дрэнная падрыхтоўка да сяўбы раённай МТС. Трактараў разаслалі па некаторых колгасах, дзе ня можна было араць, у выніку яны прастаялі па 7 дзён бяз працы.

Дрэнна забясьпечваюцца трактары гаручым, ад чаго бываюць прастоі. Нормы выпрацоўкі трактары ня выконваюць. Замест 23-х гадз... трактар у колгасе „Комунар" пр... цуе толькі 6—8 гадзін у суткі.

М. Шэшка.

Правяраем выкананьне рашэньняў IX зьезду па росту

У ГОМЕЛІ РОСТ НА ТАРМАЗОХ

Комсамолія Гомельшчыны павінна забясьпечыць выкананьне задачы ператварэньня УсеЛКСМ у шматмільённую організацыю

Да гэтага часу комсамольскія колектывы заводаў „Пролетары“, „Гомсельмаш“ „Рухавік рэволюцыі“ і Гомельскага ФЗВ чыгуначнікаў ня выканалі рашэньняў IX зьезду УсеЛКСМ аб 100 проц. ахопе рабочай моладзі комсамолам.

Процант ахопу комсамолам рабочае моладзі ў гэтых колектывах яўна нездавальняючы. Напрыклад, у ліцейным цэху Гомсельмашу з 200 чалавек рабочае моладзі толькі 25 комсамольцаў, у Гомельскім ФЗВ чыгуначнікаў з 1100 чалавек толькі 185 у комсамоле.

Пералічаныя колектывы растуць ад урачыстасьцяй да рачыстасьцяй.

Ня меншыя перашкоды росту—бяздушная валакіта з боку паасобных ячэек і колектываў да прыёму рабочае моладзі ў комсамол.

Стаўка на самацёк павінна быць біта. Гомельскія вытворчыя колектывы павінны ў бліжэйшы час забясьпечыць выкананьне лёзунгу 100 проц. ахопу рабочае моладзі комсамолам.

ТОЛЬКІ 200 У КОМСАМОЛЕ

На заводзе „Пролетары“ налічваецца 400 маладых рабочых, з якіх толькі 200 у комсамоле. Сярод гэтай чатырохсотай масы ніякай выхаваўчай працы не вядзецца, толькі некаторыя актывістыя праводзяць індывідуальныя гутаркі з некомсамольцамі, у выніку чаго за апошніх 2 месяцы ўцягнута 30 ударнікаў у комсамол.

Ёсьць прыкладныя маладыя ўдарнікі, якія знаходзяцца па-за шэрагамі комсамолу. Напрыклад, ударніца Аргава на заводзе працуе тры гады і да гэтага часу не ўцягнута ў комсамол.

Трэба адзначыць, як добры пачын гэта—організацыя на заводзе сэктару росту комсамолу і партыі.

Комсамольскаму колектыву „Пролетарыя“ трэба яшчэ шырэй разгарнуць політыка-выхаваўчую работу, каб уцягнуць у комсамол усю рабочую моладзь.

Брыгада „ЧЗ“
Рыўкіна, Гельфэр і Шухман.

У ПАЛОНЕ САМАЦЁКУ

На заводзе „Колпраца“ працуе 80 чалавек моладзі, з якіх толькі 30 комсамольцаў. Ячэйка не праводзіць сыстэматычнай выхаваўчай работы ня гледзячы на тое, што ім, як лесазаводу, дзе працуе шмат вясковай моладзі, гэта неабходна як нікому іншаму.

Дужа часта чуюцца скаргі на тое, што заявы марынуюцца на 3-4 месяцы. Гарком комсамолу таксама абмяжоўваецца прыёмачнай камісіяй, якая на жаль зацягвае разгляд заяў.

Мы лічым, што вельмі карысна было-б організаваць пазачарговыя бюро, ці паседжаньне спэцыяльна па пытаньню прыняцьця ў комсамол.

Брыгада „ЧЗ“
Кізьвер, Левін і Махцюк.

ГАНЕБНЫЯ СУАДНОСІНЫ

Гомельскі фабзавуч чыгуначнікаў налічвае 1100 асоб. Але ў гэтай школе, якая рыхтуе кваліфікаваных рабочых-актывістых толькі 185 комсамольцаў.

915 фабзайцаў па-за радамі комсамолу ў той час, калі кожны фабзавучнік павінен быць комсамольцам.

Чым тлумачыцца такое ганебнае становішча з ростам комсамолу ў ФЗВ чыгуначнікаў? Ды тым, што комсамольскі колектыў надзвычайна дрэнна праводзіць выхаваўчую працу. Організаваныя гурткі па вывучэньню статуту і програмы ЛКСМБ праводзяць працу нерэгулярна з-за адсутнасьці кіраўнікоў. Гутаркі з некомсамольцамі не праводзяцца.

Комсамольскаму колектыву ФЗВ неабходна дабіцца пералому ў справе ўцягненьня фабзавучнікаў у комсамол і зрабіць ФЗВ чыгуначнікаў комсамольскім фабзавучам.

Брыгада „Ч. З.“ Гэрашчанка, Барысенка.

Зьнішчыць парашкоды ў росьце

Комсамольскі колектыў фабрыкі імя Клары Цэткін разгарнуў масавую выхаваўчую працу, у выніку чаго комсамолам ахоплена 90 проц. рабочай моладзі ф-кі.

У апошнія дні комсамольскі колектыў яшчэ больш разгарнуў работу па ўцягненьню 100 проц. рабочай моладзі ў комсамол. Але зрух па ўцягненьню ў комсамол, які маецца на фабрыцы, тармозіцца тым, што заявы паданыя ў комсамол марудными тэмпамі праходзяць праз інстанцыі: ад бюро цэхячэйкі да гаркому комсамола.

Зараз комсамольскаму колектыву трэба яшчэ больш узмацніць выхаваўчую працу, хутчэй разьбіраць заявы аб прыёме ў комсамол, каб поўнасьцю выканаць рашэньні комсамольскіх зьездаў аб 100 проц. уцягненьні ў комсамол рабочай моладзі.

Юнкор „Ч. З.“ Іохведаў.

Чаму толькі 24 проц. рабочай моладзі ў ЛКСМБ?

На фабрыцы „Усход“ (Менск) працуе 345 чал. моладзі, што складае палову усіх рабочых фабрыкі. У ЛКСМБ усяго 83 чал. альбо 24 пр. усяе рабочай моладзі.

Гэтая лічба гаворыць аб тым, што ячэйка ЛКСМБ фабрыкі „Усход“ нічога не зрабіла па выкананьню рашэньняў зьездаў аб 100 проц. ахопе рабочай моладзі комсамолам. Комсамольская ячэйка не вядзе ніякай культмасавай работы сярод рабочай моладзі

Шмат моладзі не ахоплена ўдарнымі брыгадамі і не закантрактавана на фабрыцы да канца пяцігодкі. Уся праца сярод беспартыйнай моладзі па ўцягненьню яе ў комсамол заключаецца ў тым, што ячэйка організавала гурткі па падрыхтоўцы у ЛКСМБ.

Але і гэтыя гурткі працуюць нерэгулярна і іх наведвае зусім нязначная колькасьць моладзі.

„Лёгкі кавалерыст“ фабрыкі Віленчык.

Гомсельмаш запамятаў аб росьце комсамолу

Завод-волат „Гомсельмаш“, які мае ўсесаюзнае значэньне, налічвае шмат моладзі. Каля 70 проц. усіх рабочых—моладзь. Але на жаль сярод гэтай моладзі надзвычайна дрэнна абстаіць справа з выхаваўчай працай і працай па ўцягненьню ўдарнікаў у комсамол.

Комсамольскі колектыў не абгаварыў пытаньне росту на комсамольскіх сходах, ня вёў і не вядзе штодзённай працы па ўцягненьню у комсамол.

Праца па росту ідзе самацёкам, кампанейскі. У Ленінскія дні некалькі маладых рабочых падалі заявы аб уступленьні ў комсамол, але да сёнешняга дню хлопцы ня ведаюць ці прыняты яны ў комсамол.

Ня дзіва, што ў выніку такой працы асноўны цэх заводу—ліцейны—налічвае толькі 25 комсамольцаў у той час як там працуе 200 чалавек моладзі.

Комсамольскаму колектыву неабходна зьвярнуць належную ўвагу пытаньню росту.

Брыгада „Чырвонай Зьмены“
Шпіцэр і Барчман.

Узмацніць за летні пэрыод вывучэньне вайсковай тэхнікі

Другі пленум ЦК ЛКСМБ, прызнаўшы нездавальняючай работу раду організацый па выкананьню рашэньняў 9 і 10 зьездаў комсамолу аб ваенізацыі, паказаў практычныя задачы і формы вайсковай падрыхтоўкі. Асноўнымі формамі былі намечаны: у горадзе вучэбны пункт, у вёсцы—гурток АСОавіяхэму. Гэтымі пунктамі неабходна было ахапіць комсамольцаў, якія вучацца ў 1-й і 2-й ступені, а таксама па асобным спэцыяльным тэхнічным відам падрыхтоўкі.

Па 45 раёнах, ад якіх атрыманы матар'ялы, мы маем наступны малюнак, які характарызуе выкананьне рашэньняў ЦК ЛКСМБ.

ЦК ЛКСМБ і ЦС АСОавіяхэму дадзена заданьне ахапіць вайсковай вучобай па гэтых раёнах 9.810 чал. Ахоплена 9.214 чал., што складае 94 проц. Спэцыяльнымі відамі ахоплена 532 чал., што складае да агульнай колькасьці ахопленых 5,8 проц. Гэты процант зьяўляецца яўна нездавальняючым і гаворыць аб адсутнасьці павароту тварам да аўладаньня вайсковай тэхнікай. Калі ўзяць паасобныя раёны, дык тут мы бачым рознастайныя як формы вучобы, так і якасьць.

Вучэбнымі пунктамі ахоплены комсамольцы Бабруйскай, Рагачэўскай, Крупскай організацыі. Горацкая, Чачэрская і інш. стварылі вучэбныя адзінкі (рота-узводы і г. д.). Менская, Віцебская, Барысаўская, Магілеўская, да гэтага часу яшчэ праводзяць заняткі ў гуртках. Вопыт паказаў жыцьцёвасьць і мэтазгоднасьць вучэбных пунктаў і вучэбных адзінак, гуртковая-ж сыстэма ніякім чынам не адпавядае пастаўленым задачам вайсковай падрыхтоўкі комсамолу.

Якасьць падрыхтоўкі як у сэнсе ахопу комсамольцаў, так і набыцьця ведаў, ня ўсюды аднолькава. Бабруйскаму РК заданьне па ахопу комсамольцаў вайсковай вучобай выканаў на 335,6 проц. Спэцыяльнай падрыхтоўкай Бабруйскай організацыяй ахоплена на 21,5 проц. Ня кепска з ахопам у Мазырскім, Горацкім, Любаньскім, Слуцкім і Клімавіцкім раёнах. Гэтыя раёны перавыканалі дадзенае заданьне. Такія-ж раёны, як Хоцімскі і Хойніцкі выканалі заданьне: першы на 28,3 проц., другі—на 17 проц. У радзе організацый, як па ўсваеньню так і па наведваньню, справа з рук вон кепска.

Нашыя мерапрыемствы на летні пэрыод: працягваць вучобу, каб скончыць 1 і 2 ступень, адначасова з гэтым узмацніць вывучэньне вайсковай тэхнікі. Так, лягернай падрыхтоўкай па тэхнічных галінах ахапіць—6310 чал., вайскова-санітарнай работай—13.000 чал. У парадку шэфства над авіяфлётам падрыхтаваць 390 чал. наступных спэцыяльнасьцяй: шофэраў—100, матарыстых—110, фото-лябарантаў—80, мэтэоролёгаў—60, радыстых—30, радыстых каротказхвалёвікаў—750 чал., шофэраў па лініі аўтадору—100 чал. У пагранраёнах сіламі погран-атрадаў падрыхтаваць 1700 чал. Усе гэтыя мерапрыемствы зьяўляюцца першапачатковымі, што будзе складаць 25-30 проц. організацыі, ахопленай падрыхтоўкай тэхнічнымі сродкамі барацьбы.

Гузікаў.

6-месячнік ліквідацыі політняпісьменнасьці

Комсамолія гораду, вясковыя ячэйкі чакаюць ад вас дапамогі!

Комсамольцы гарадзкіх ячэек, вы яшчэ дрэнна дапамагаеце вясковым ліквідаваць іх політняпісьменнасьць. Двухтыднёвік па збору сродак і літаратуры, абвешчаны ЦК Усе ЛКСМ правалены вамі, мобілізацыя пропагандыстых на вёску і пасылка пропбрыгад не праводзіцца

Пералом у гэтай галіне першым зрабіў колектыў Белдзяржбуду (Менск). Па прыкладу гэтага колектыву організуйце соцспаборніцтва паміж ячэйкамі і колектывамі на ўдарнае выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў па ліквідацыі політняпісьменнасьці комсамолу вёскі.

Комсамольцы „Варашылава“ і „Комунара“, ПРЫМАЙЦЕ ВЫКЛІК!

Комсамольскі колектыў Белбудаб'яднаньня першым у г. Менску стаў дапамагаць падшэфнай комсамольскай організацыі Астрашыцка-Гарадоцкага сельсавету ў паходзе за аўладаньне політмінімумам.

Колектыў узяў на сябе наступныя абавязкі: сабраць 150 р. на закупку літаратуры па пытаньнях політмінімуму; організаваць збор політлітаратуры сярод комсамольцаў; організаваць завочную консультацыю для вясковых комсамольцаў па пытаньні політмінімуму. У консультацыі прымуць удзел лепшыя комсамольцы і члены партыі з партыйнага і комсамольскага колектываў.

Колектыў узяў на сябе абавязак закупіць для кожнага комсамольца-падшэфніка па аднаму экзэмпляру выходзячых тэм па політмінімуму. Акрамя гэтага, у сельсавет выяжджаюць члены колектыву для правядзеньня нарады апоргаў па гэтаму пытаньню.

Бюро колектыву Белбудаб'яднаньня выклікае на соцыялістычнае спаборніцтва колектывы „Комунара“ і „Варашылава“ на лепшую дапамогу падшэфнікам у правядзеньні політмінімуму.

Бюро колектыву Белдзяржбуд чакае ад вышэйпералічаных колектываў неадкладнага адказу.

ШТО ПАКАЗАЎ ПОЛІТБОЙ у Капаткевіцкім раёне

Політбой, праведзены ў першых лічбах мая месяца ў Капаткевіцкім раёне даў жудасныя вынікі. Ён паказаў, што пераважная большасьць вясковай організацыі комсамолу політычна зусім няпісьменна. Але ня гледзячы на гэта, быро райкому комсамолу пасьля політбою не разгортвае ніякай работы ў падрыхтоўцы організацыі да правядзеньня 6-ці месячніка ліквідацыі політняпісьменнасьці.

Комсамольцы не разьбіты на групы, у ячэйках не вылучаны кіраўнікі гурткоў і г. д.

У местачковай ячэйцы такое-ж самае становішча, як і ў вясковых ячэйках, хаця РК ЛКСМБ і знаходзіцца пад бокам.

Ударнік

Да ведама Быхаўскага РК ЛКСМБ

У Макараўскай ячэйцы Быхаўскага раёну політвучоба сарвана. Толькі адзін раз за ўсю зіму былі праведзены політзаняткі. Чырвонаармейцы ўзялі ячэйку на буксір, выпрацавалі разам з ёю плян вучобы і прыходзілі праводзіць політзаняткі, але... комсамольцы ні разу не зьявіліся. Комсамолец.

РК—вінавайца ў зрыве

Стара-Дароская райорганізацыя комсамолу яшчэ не ўключылася цалкам у распрацоўку і выкананьне рашэньняў апошніх зьездаў комсамолу. Райком комсамолу абмежаваўся толькі тым, што прыслаў матар'ялы зьезду. Але большасьць ячэек, у прыватнасьці местачковыя, ня прыступалі да іх распрацоўкі.

Местачковыя ячэйкі з-за опортуністычнай бязьдзейнасьці ў падрыхтоўцы да саўбы занесены Стара-Дароскім сельсаветам на чорную дошку. М.

Запісана 30, займаюцца... 3

Політвучоба ў Заслаўскім ШКМ выпала з цэнтру ўвагі комсамольскай ячэйкі. У гурток па ліквідацыі політ-няпісьменнасьці запісалася 30 чалавек, а наведвае... 3-5 ч.

С. Бальшавіцкі.

УКЛЮЧАЕМСЯ ВА УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД

Комсамольскія ячэйкі, юнкоры, „кавалерыстыя", працоўная моладзь, у бой за ліквідацыю прарываў на фронце культбудаўніцтва!

Да ўсёй культарміі, шматтысячнай арміі рабселькораў і насьценкораў, ударнікаў заводаў і палёў, ленінскага комсамолу, юных ленінцаў, навукова-тэхнічных сіл, да усіх профсаюзных, савецкіх і грамадзкіх організацый БССР

3-ці рашаючы год 5-годкі зьяўляецца ня толькі годам завяршэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі у СССР, ён зьяўляецца рашаючым годам у вырашэньні першачарговых задач культурнай рэволюцыі.

XVI-ты зьезд Ленінскай партыі ўказаў.

„Адной з рашаючых прадпасылак культурнай рэволюцыі зьяўляецца ліквідацыя няпісьменнасьці, увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня, а таксама рэформа школы і ажыцьцяўленьне політэхнічнай асьветы

Чырвонаштандарнае настаўніцтва і асноўная маса асьветнікаў Савецкай Беларусі рашуча ўзяліся за выкананьне гэтых важнейшых задач.

30-тысячная армія асьветнікаў БССР у асобе 3-га Усебеларускага настаўніцкага зьезду урачыста заявіла, што разам з рабочай клясай пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі будзе яшчэ больш рашуча змагацца за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэволюцыі за выкананьне плянаў 3-га, рашаючага году 5-годкі.

Асьветнікі Беларусі з энтузіязмам бяруцца за выкананьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху.

Мы уключыліся ва ўсебеларускі рэйд ударных брыгад газэт „Сав. Бел" і „ЗКП", мы будзем біцца.

За адзіны культплян,

За выкананьне пастановы СНК БССР ад 13 мая 1931 г. аб ўсеагульным абавязковым навучаньні.

За разгорнутую падрыхтоўчую працу да новага навучальнага году.

За 100 проц, граматны прызыў у Чырвоную армію

За політэхнізацыю асьветы.

За ахоп ўсіх рабочых, колгасьнікаў паходам за тэхнікай.

За падрыхтоўку пролетарскіх пэдкадраў.

За пасьпяховае скончэньне вяснавой сяўбы.

За разгортваньне падрыхтоўкі да ўборачнай і асеньняй пасеў-кампаніі.

За далейшы наступ у галіне соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

За выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

За выкананьне плянаў лесазагатовак, сплаву і торпраспрацовак.

За падрыхтоўку чыгуначнага транспорту да асеньніх перавозак.

За сваячасовы пуск новых пабудоў з ліку „518".

За падваеньне тыражу пэрыодычнага друку.

Мы заклікаем усіх ударнікаў, культармейцаў, шматтысячную армію ўдарнікаў-рабселькораў, ударнікаў заводаў і палёў уключыцца ў рэйд ударных брыгад газэт „ЗКП", „Сав. Бел." і ЦП Балпрацасьветы і пад кіраўніцтвам КП(б)Б рашуча змагацца за вырашэньне задач, пастаўленых рэйдам.

Мы прад'яўляем наступныя рахункі:

Організатару мас—бальшавіцкаму друку БССР

ЦО КП(б)Б „Зьвязьдзе", газэтам „Рабочий", Чырвоная Зьмена", „Акцябр" „Орка" і ўсім раённым газэтам, усяму нізавому друку ўключыцца ў рэйд ударных брыгад і адзіным фронтам змагацца за ажыцьцяўленьне задач пастаўленых рэйдам.

Комсамолу Беларусі

а) Па-бальшавіцку ажыцьцяўляць шэфства над усеагульным навучаньнем.

б) Мобілізаваць на пэдвучобу ў асеньні набор ня менш 500 комсамольцаў.

в) Вылучыць 10000 культармейцаў для работы ў лікпунтах, хатах-чытальнях і нардамох.

г) Узяць шэфства над політэхнізацыяй.

Арміі юных ленінцаў—піонэрыі БССР

а) Уключыцца ў рэйд ударных брыгад.

б) Змагацца за 100 проц. выкананьне якасных і колькасных паказчыкаў культбудаўніцтва.

в) Да 14-гадавіны Кастрычніка павялічыць армію піонэрыі ў два разы.

г) Даць новыя тысячы юнкораў і насьценкораў і ўдарных брыгад пролетарскаму юнацкаму друку.

д) Кожны піонэр-школьнік—ударнік.

Профсаюзам

а) Справу культурнага будаўніцтва (усеагульнае навучаньне, політэхнізацыя ліквідацыя няпісьменнасьці) зрабіць справай кожнага ЦП, фабзаўмясцкому і рабачкому.

б) Да 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі ліквідаваць няпісьменнасьць сярод усіх членаў саюзаў.

в) Да 1-га студзеня ліквідаваць няпісьменнасьць сярод утрыманцаў членаў саюзаў.

г) Сваячасова перадаваць сродкі на ўсеагульнае навучаньне і ліквідацыю няпісьменнасьці і пагасіць усю запазычанасьць на іх да 1-га ліпеня 1931 году.

д) Зараз-жа распачаць падрыхтоўку да уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

е) Мобілізаваць 20.000 культармейцаў для работы па лікбезу.

ж) Паслаць на вучобу ў пэдагогічныя навучальныя ўстановы 1500 рабочых.

з) Выканаць пастанову ЦСПСБ аб прасоўваньні газ. „ЗКП" у кожны чырвоны куток, клюб, фабком, завком.

Рабочым і колгасьнікам

а) Лепшых ударнікаў у брыгады „Прыхільнікаў політэхнізацыі"—у шэрагі культармейцаў.

б) Узяць шэфства над мясцовымі аддзеламі народнай асьветы.

в) Быць ініцыятарамі ў організацыі саветаў культбудаўніцтва і актыўна удзельнічаць у іх працы.

г) Лепшых ударнікаў заводаў і палёў паслаць у пэдагогічныя навучальныя установы.

Райвыканкомам, гарсаветам і сельсаветам

а) Да 1-га верасьня скончыць новае школьнае пляновае будаўніцтва і рамонт.

б) Поўнасьцю спагнаць і скарыстаць сродкі па самаабкладаньню насельніцтва, вызначаныя апошнім на культбудаўніцтва.

в) Закончыць да 1-верасьня будаўніцтва па-за пляновых школ.

г) Забясьпечыць цэнтралізаваны выраб школьнай мэблі і даць яе да пачатку занятку ў школы.

д) Укамплектаваць масавыя політасьветныя установы працаўнікамі.

е) Поўнасьцю выканаць пастанову СНК БССР аб політасьветных установах.

Скарыстаць работу камітэтаў садзейнічаньня усеабучу і штабаў культэстафэты.

Скарыстоўваць інспэктуру Нарасьветы па прамому прызначэньню, вызваліць ад тэхнічнай нагрузкі.

ж) Систэматычна заслухоўваць даклады інспэктуры нарасьветы і політасьветных устаноў.

Рабочым друкарні імя Сталіна

а) Змагацца за выпуск падручнікаў раней вызначаных плянам тэрмінаў.

б) Даць добраякасны падручнік.

в) Сачыць за тым, каб падручнікі праз два дні пасьля выхаду з друку накіроўваліся ў раёны.

Наркамасьветы

1. Да 1-га ліпеня давесьці культплян 1931-32 навучальнага году да раёну і кожнай культасьветнай установы.

2, Да 15 чэрвеня скончыць складаньне новых програм і падручнікаў адпавядаючых запатрабаваньням політэхнічнай школы.

3. Організаваць пры НКА інстытут па перакваліфікацыі кадраў нарасьветы.

4. Летнімі кароткатэрміновымі курсамі перападрыхтоўкі ахапіць ня менш 2000 настаўнікаў.

5. Да 15 жніўня скончыць укомплектаваньне школ настаўнікамі.

6. Ажыцьцявіць сыстэматычны тэхнічны кантроль над школьным будаўніцтвам.

7. Узмацніць мэтадычнае кіраўні-тва раёнамі.

Белдзяржвыдавецтву

а) Да 1 ліпеня скончыць друкава-не програм, а да 1 жніўня друкава-не асноўных падручнікаў.

б) Да 10 жніўня прасунуць падр-нікі на пэрыфэрыю.

в) Да 1 ліпеня выдаць спэцыяль-літаратуру па пытаньнях уборачна-асеньня-пасеўнай кампаніям.

Белкоопсаюзу

а) Прасунуць у нізавую сетку-15 ліпеня програмы і да 15 жніўн-падручнікі, пісьмовыя і канцэляр-прылады.

б) Да 15 верасьня, выканаць і -ставіць на месцы 30 проц. зая-НКА на вопратку і абутак, да 1-лістапада 50 проц. і астатнія 20 пр-да 15 сьнежня.

в) Забясьпечыць школы катл-кіпяцільнікамі і начыньнем для га-чага сьнеданьня ў школах.

г) Бесьперабойна забясьпечваць ш-лы продуктамі харчаваньня, газай.

ВСНГБ

а) Організаваць фабрыку-майст-ню па вырабу дапаможнікаў, інст-мэнтаў і абсталяваньня для політ-нічных пакояў пры школах.

б) З 1931-32 навучальнага году п-мацаваныя да прадпрыемстваў шк-ператварыць у цэхі фабрык і завод-уключыўшы іх у прамфінплян пр-прыемстваў з 1932 г.

в) Прыняць захады, каб да пача-навучальнага году прамысловасц-былі выкананы заказы на політэх-нае абсталяваньне для школ.

г) Організаваць у БССР завод ВТ-

Белдзяржснабу

а) Бесьперабойна забясьпечв-школьнае будаўніцтва матар'яламі.

Навукова-тэхнічным сілам

а) МБІТ, Варвітсо, Сэкцыі наву-вых працаўнікоў узяць на сябе кір-ніцтва па організацыі на прадп-емствах гурткоў па аўладаньню т-нікай.

б) Усім навуковым і інжэнэра-т-нічным працаўнікам і студэнцтву -дустрыяльных ВНУ і тэхнікумаў уз-на сябе кіраўніцтва гурткамі па аў-даньню тэхнікай.

Белколгасцэнтру

а) Няўхільна выконваць пастан-ўраду аб перадачы дамоў раскула-ных пад культасьветныя ўстановы.

б) У вытворчых і фінплянах кол-саў прадугледзіць сродкі на гарач-сьнеданьні, дапамогу школам і лік-у разьмеры 50 проц. культбытав-фонду.

в) Паслаць на пэдагогічную вучо-2000 лепшых ударнікаў-колгасьнік-

Белдзяржкіно

а) Організаваць дзіцячыя кіно-атры ў гарадох Віцебску. Гомелі. -гілеве, Барысаве.

б) Ва ўсіх стацыянарных кіно-атрах наладжваць дзенныя кіно-сэ-сы для школьнікаў і піонэраў.

в) Наладзіць вытворчасьць дзіцяч-кіно-фільмаў, адпавядаючых запат-баваньням політэхнічнай школы.

г) Популярызаваць задачы і -рэйду ўдарных брыгад ва ўсіх к-і кіно-перасоўках у выглядзе лёзун-і кіно-хронікі.

ЦП Саюзу Працасьветы

„Чырвоная Зьмена" ўключае-ва ўсебеларускі рэйд ударных бр-гад па праверцы выкананьня д-рэктыў партыі і ўраду ў гал-культбудаўніцтва.

Зварочваемся да ўсіх комсамо-цаў, рабочай моладзі, колгасьнік-саўгасьнікаў і працоўнай адзі-асобніцкай бядняцка-серадняцкай -ладзі, да юнкораў і кавалерыст-уключыцца ў гэтую праверку-штодня дасылаць матар'ялы ў на-газэту.

Месячнік друку

Месячнік друку правядзем пад знакам масавай праверкі выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб друку і рабселькораўскім руху

Не павінна быць ніводнага нявыкананага пункту, ніводнай не ажыцьцяўленай пастановы

Месячнік друку—на баявыя рэйкі

Праца па разгортваньню месячніка друку ў Недальскім сельсавеце (Бягомельскі раён) праходзіць здавальняюча. Замест 5-ці селькораў, якіх налічвалася да гэтага часу, вырас зараз селькораўскі гурток у 30 асоб, якія зьяўляюцца актыўнымі дапісчыкамі раённай газэты „Колгасны змагар", а таксама і насьценгазэт.

Комсамольская ячэйка разам з селькорамі выдае кожны месяц насьценгазэту „Колгасны прамень", адначасова наладзіўшы выпуск насьценгазэт у двух колгасах.

Трэба адзначыць, што насьценгазэта „Колгасны прамень" зьявілася сапраўдным змагарам і організатарам мас колгасьнікаў і працоўнага насельніцтва на правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі. Насьценгазэта пабальшавіцку бічуе разгільдзяяў, выкрываючы ілжэ-ўдарнікаў і спажывецкія настроі ў колгасе.

„Колгасны прамень" значную работу правяла ў напрамку зьнішчэньня недахопаў па організацыі працы ў колгасе.

Пры насьценгазэце створаны зараз куток „Чырвонай Зьмены", які зьяўляецца сыгналізатарам і організатарам па концэнтрацыі ўвагі ўсёй працоўнай моладзі на барацьбу з прарывамі, аб якіх піша „Чырвоная Зьмена".

Аднак маюцца недахопы. Газэта яшчэ ня поўнасьцю асьвятляе бальшавіцкія мэтады працы ў колгасе як соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Насьценгазэта слабую ўвагу ўдзяліла распаўсюджваньню газэт.

К месячніку друку газэта абавязваецца наладзіць больш сталую работу з селькорамі і насьценкорамі, сыстэматычна асьвятляць работу комсамольскай ячэйкі, дабіцца таго, каб да скончэньня вясеньняй пасеўкампаніі уся працоўная моладзь нашага сельсавету выпісвала газэту „Чырвоная Зьмена" у час месячніку ў кожным насельніцкім пункце сельсавету выпусьціць насьценгазэту.

Выклікаем на соцспаборніцтва комсамольскую ячэйку Іваньскага сельсавету.

Ядзя Бабіцкая

Месячнік друку ўскалыхнуў рабочых

На фабрыцы „Комунарка" маецца шматтыражка і 4 цэхавыя насьценгазэты. У сувязі з правядзеньнем месячніку друку, партыйны і комсамольскі колектывы правялі агульны сход рабочых на пытаньню вынікаў усесаюзнай нарады рабселькораў.

Зараз комсамольскі колектыў прыступіў да сталай організацыі юнкораўскай работы, бо да гэтага часу яна зусім адсутнічала. Комсамольскі колектыў нават ня ведаў аб колькасьці юнкораў.

Становішча насьценгазэт на фабрыцы яшчэ не на належнай вышыні, бо яны яшчэ не наблізіліся шчыльна да вытворчага жыцьця, не мобілізоўваюць масы на ліквідацыю прарываў, якія маюцца на ф-цы. Наогул, трэба сказаць, што зараз праца па падрыхтоўцы к рабселькораўскаму зьезду і разгортваньне месячніку друку ўсё-ж праходзіць здавальняюча.

Гельдзін і Шыфман.

Хто адкажа?

Тры разы Мсьціслаўскі райком КП(б)Б склікаў нараду рабкораў, юнкораў і насьценкораў, але нарада ні разу не састалася. Нізавыя партыйна-комсамольскія ячэйкі гэтага р-ну недаацэньваюць політычнае сутнасьці разгортваньня рабселькораўскага руху. Па Дутчыцкім сельсавеце ня знойдзеце ніводнай насьценгазэты. Крытыка і самакрытыка ў гэтым сельсавеце не на належнай вышыні. Праца грамадзкіх організацый і становішча колгасаў не адбіваецца ў насьценгазэтах, што тармозіць сваячасовую ліквідацыю прарываў ў працы колгасаў і організацый.

Трэба зараз-жа падняць рабселькораўскі рух на Мсьціслаўшчыне і гэтым самым узмацніць барацьбу за правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі ў справе перабудовы сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад.

Віця К.

НЕ ПАСЛАБІМ РАБОТЫ І НАДАЛЕЙ

Газэта „Шлях да соцыялізму" Юравіцкай школы колгаснай моладзі мае значнае дасягненьне ў тым, што яна па-сапраўднаму павярнулася тварам да сучаснага жыцьця. Газэта стала сапраўды масавай газэтай. У працу апошнай уцягнута маса насьценкораў.

Рэдколегія сваю працу набудавала па сэктарах. Кожны сэктар мае адпаведную галіну працы, праводзячы яе ўдарнымі тэмпамі. Брыгады за гэты час правялі дзьве нарады насьценкораў, на якіх было завострана ўвага на пытаньнях вясеньняй пасеўкампаніі і выніках усесаюзнай нарады рабселькораў. Брыгады за гэты час выпусьцілі і організавалі дзьве насьценгазэты пры колгасе „Чырвоны сьцяг", правялі абгляд працы ТПН і Бязбожнік. За ўвесь час існаваньня газэты было зьмешчана 360 допісаў, якія зьяўляліся сапраўды жыцьцёвымі, сыгналізуючымі ў справе правядзеньня ўсіх гаспадарча-політычных кампаній.

Трасьцянок Алена.

Зьнішчыць выпадкі не рэагаваньня

Пры аўта-школе ФЗВ выпускаецца насьценгазэта. За апошнія 4 месяцы насьценгазэта стала па-сапраўднаму адбіваць жыцьцё школы, разгарнула барацьбу за выкананьне прамфінпляну.

Аднак трэба адзначыць, што ў рабоце насьценгазэты маюцца некаторыя недахопы, якія патрабуюць хутчэйшага зьнішчэньня. Колектыў ЛКСМБ і рэдколегія ніякай работы з насьценкорамі не праводзяць, не згуртавалі вакол сябе ўсю юнкораўскую масу. Праца па распаўсюджваньні друку на сёнешні дзень праходзіць слаба, асабліва дрэнна абстаіць справа з падпіскай на газэту „Чырвоная Зьмена".

Рэагаваньне на допісы стаіць не на належнай вышыні. Ужо больш чым 2 месяцы як газэта сыгналізуе аб загадчыку гаспадаркай Драздове, які мае за сабою цэлы шэраг памылак, а адміністрацыя ніякіх захадаў не прымае. **Х. Штурмавы.**

Паведамленьне

Сёньня, 24-У-31 г. а 7-ай -дзіне ўвечары ў памяшканьні га-камолу адбудзецца нарада кіраў-коў груп „ЛК" і лёгкіх кава-рыстых ўсіх піонэрбаз г. Менс-

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТА-

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599